**В. С. Забродская**

# ЗАМАК У ЗАСЛАЎІ

Заслаўскі замак быў пабудаваны прыкладна ў сяр. XVI ст. на месцы старажытнага дзядзінца ў стылі стараітальянскай фартыфікацыйнай школы як умацаваная рэзідэнцыя І. Глебавіча разам з кальвінскім зборам, калі гаспадары прытрымліваліся кальвінізму. Ён спланаваны ў форме няправільнага чатырохвугольніка перыметрам больш за 600 м са стрэльчатымі бастыёнамі. Замак быў практычна непрыступным. Чатыры бастыёны ўзмацнялі абарончую лінію пасярэдзіне курцін. Ад горада замак аддзяляўся ровам.

У замкавых валах, абмураваных раней каменнем і цэглай, знаходзіліся дзве брамы – Вялікая і Малая. Вялікая брама, якая размяшчалася з паўднёвага боку пад прыкрыццём двух бастыёнаў, уяўляла сабой квадратнае ў аснове двухпавярховае збудаванне са стромым чатырохсхільным дахам. Ніжні паверх праразаўся арачным праездам з варотамі, перад якім, магчыма, быў драўляны пад’ёмны мост. Па тым, што ў збудаванні было шмат акон, можна меркаваць, што тут знаходзілася вартоўня, казарма, гаспадарскія памяшканні. Малая брама – мураваная арка, урэзаная ў насып вала, выкарыстоўвалася для выхаду на прамежкавы бастыён з паўночнага боку крэпасці.

Амаль у цэнтры замчышча ўзнімаецца храм абарончага тыпу, у архітэктуры якого спалучаюцца рысы готыкі і рэнесансу. Пабудаваны як кальвінскі збор (другая палова XVI – пачатак XVII ст.) цяпер вядомы як касцёл Св. Архангела Міхаіла, а з 1840 г. стаў Спаса-Праабражэнскай царквой. У плане гэта аднанефны мураваны прамавугольны будынак з двухсхільным дахам. З заходняга боку да яе прымыкае прамавугольная ў аснове вежа, якая з трэцяга яруса пераходзіць у васьмярык, на вышыні 35 м увенчаны шатровым дахам. Ядро абарончай сістэмы храма складаюць байніцы чацвёртага і пятага ярусаў. У вежу вядуць два ўваходы – паўночны, які выкарыстоўваўся для ўрачыстых выпадкаў, і паўнёвы. Падлога ў храме – з керамічных плітак. Унутры тоўстых муроў паўнёва-заходняга кута збудавана вінтавая лесвіца. Пад алтарнай часткай зроблены два склепы.

З 1678 г. Казімір Сапега заснаваў у замку дамініканскі кляштар. У 1778–1782 гг. Дамінік Пшаздзецкі згодна з праектам архітэктара Карла Спампані ўзвёў палац і шэраг іншых збудаванняў за межамі замка. У XIX ст. паселішча ператварылася ў мястэчка, гаспадароў якога крэпасць не цікавіла. Таму абарончыя ўмацаванні з цягам часу прыходзілі ў зняпад.

Археалагічнае вывучэнне Заслаўскага замка вядзецца з сяр. XIX стагоддзя. Знаходкі на тэрыторыі замка датуюцца X–XIII стагоддзямі. Зроблена кансервацыя рэшткаў замка, якую цяпер можна пабачыць на падыходзе да Спаса-Праабражэнскай царквы. У Спаса-Праабражэнскай царкве ў 1977 г. быў адкрыты філіял Дзяржаўнага музея БССР – Музей рамёстваў і народных промыслаў Беларусі. З 1967 г. Заслаўскі замак уваходзіць у Заслаўскі гістарычна-археалагічны запаведнік. Да нашых дзён захаваліся толькі руіны замкавай брамы, валы і равы замка.